# Электралічыльнікі выпускаюцца ў Брэсце

**На паліцах магазінаў абласного цэнтра з'явіліся электрычныя лічыльнікі, якія яшчэ нядаўна былі вялікім дэфіцытам. Між тым, нават назіральныя пакупнікі наўрат ці ведаюць, што выпускаюцца яны ў Брэсце.**

Сёння, калі пераход да рыначнай эканомікі большасць нашых прадпрыемстваў прымушае працаваць не на склад, а на спажыўца, новымі відамі прадукцыі нікога асабліва не ўразіш. Між тым, першую партыю электрычных лічыльнікаў, якую выпусціў Брэсцкі электрамеханічны завод, можна з упэўненасцю называць падзеяй у жыцці нашай вобласці.

У былым СССР электрычнымі лічыльнікамі нашу рэспубліку забяспечваў Вільнюскі электрамеханічны завод, які з распадам Саюза пачаў прадаваць іх за валюту. Яе ж у Беларусі катастрафічна не хапае і на больш жыццёва неабходныя рэчы. Вось і ўзяліся спецыялісты завода за распрацоўку дэфіцытных прыбораў, якія ў Беларусі раней не выпускаліся.

На электрамеханічным заводзе ў Санкт-Пецярбурзе была куплена дакументацыя, над якой не адзін месяц працавалі канструктары і тэхнолагі. Вынікам гэтай працы стала тое, што па сваіх тэхнічных характарыстыках брэсцкі электрычны лічыльнік атрымаўся значна лепшы за прататып. Ён мае меншую вагу, што ўжо вельмі важна. На яго вытворчасць патрэбна менш медзі, латуні, сталі, пластмасы і другой сыравіны, якой няма ў Беларусі.

Ужо зроблена 4 тысячы 759 электралічыльнікаў. На жаль, задаволіць усе заяўкі, якія прыходзяць у адрас прадпрыемства, пакуль што брэсцкія вытворцы не могуць, бо серыйны выпуск прыбораў толькі распачынаецца.

Зараз брэсцкія распрацоўшчыкі займаюцца падрыхтоўкай вытворчасці яшчэ аднаго лічыльніка - газавага. У хуткім часе попыт на яго будзе не меншы, чым на электрычны. Раней неабходнасці ў іх вытворчасці не было, а зараз усе мы павінны эканоміць і плаціць за тое, што выкарысталі. І не толькі таму, што газ стаў значна даражэйшы, але і таму, што яго ў нашай рэспубліцы не хапае. Так што брэсцкія распрацоўшчыкі ў гэтым плане ідуць у нагу з часам.

На базе газавых лічыльнікаў заходніх краін быў распрацаваны свой прыбор, які можна ўстанавіць у кожнай кватэры. Цяпер ідзе падрыхтоўка да іх выпуску.

Праблем у гэтай новай справе шмат. Аднак першая партыя газавых лічыльнікаў будзе выпушчана ў бягучым годзе.

Вытворчасць газавых і электрычных лічыльнікаў разлічана на сто тысяч штук у год.

Тамара ЦІБАРОЎСКАЯ.